# Насустрач 70-годдзю БССР і КПБ

І. В. ЦАРУК, У. Р. ІВАШЫН

## У БРАЦКАЙ СЯМ'І НАРОДАЎ

1 студзеня 1979 года Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка адзначае сямідзесяцігоддзе сваёй дзяржаўнасці. Нараджэннем і дасягненнямі Савецкая Беларусь абавязана Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, якая з'явілася паваротным пунктам у гісторыі чалавецтва і аказала рашаючы ўплыў на лёс усіх народаў Расіі.

У звароце II Усерасійскага з'езда Саветаў «Да рабочых, салдат і сялян», а затым у «Дэкларацыі правоў народаў Расіі» абвяшчаўся поўны разрыў з палітыкай прыгнёту, прызнавалася права народаў Расіі на ўтварэнне сваіх нацыянальных дзяржаў. Права нацый на самавызначэнне, якое стала канстытуцыйнай нормай, з'явілася юрыдычным выражэннем гістарычнага імкнення нацый да свабоднага развіцця і палітычнага раўнапраўя.

Нацыяналістычна настроеная буржуазія спрабавала выкарыстаць права нацый на самавызначэнне для таго, каб захапіць уладу, задушыць рэвалюцыю і ліквідаваць дыктатуру пралетарыяту. Але беларускі народ, у першую чаргу рабочы клас і бяднейшае сялянства, адзіную гарантыю справядлівага вырашэння сацыяльных, палітычных, культурных, у тым ліку і нацыянальных пытанняў бачылі ў стварэнні рэспублікі Саветаў.

Працоўныя Беларусі пад кіраўніцтвам Паўночна-Заходняга абласнога Камітэта РСДРП(б) са зброяй у руках актыўна абаранялі сваю ўладу як ад знешняй інтэрвенцыі, так і ад унутранай контррэвалюцыі. Беззапаветнай узброенай барацьбой на франтах грамадзянскай вайны і ў партызанскіх атрадах рабочыя, сяляне выказвалі сваё прызнанне Савецкай уладзе. Яны лічылі сябе часткай вялікай рэвалюцыйнай арміі Краіны Саветаў, якая адстойвала ідэі Кастрычніка, а гэта значыць і нацыянальную праграму бальшавіцкай партыі і Савецкага ўрада.

Стварэнне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці прайшло складаны і цяжкі шлях барацьбы з ворагамі сацыялістычнай рэвалюцыі. Сур'ёзнай перашкодай на гэтым шляху былі беларускія буржуазныя нацыяналісты і створаныя імі нацыяналістычныя арганізацыі — Вялікая беларуская рада, Цэнтральная рада беларускіх арганізацый і інш. Так, Беларуская рада з мэтай захопу ўлады ў свае рукі склікала 15 снежня 1917 года так званы Усебеларускі з'езд. Задумы буржуазных нацыяналістаў не ўвянчаліся поспехам. Па патрабаванню працоўных з'езд быў распушчаны.

У сваю чаргу Паўночна-Заходні Камітэт РСДРП(б) праводзіў вялікую падрыхтоўчую работу па стварэнню беларускай рэспублікі. Аднак напад кайзераўскай Германіі на Савецкую краіну ў лютым 1918 года, акупацыя Беларусі прыпынілі работу па стварэнню рэспублікі.

Пасля вызвалення Беларусі ў снежні 1918 года ЦК партыі прыняў рашэнне аб неабходнасці ўтварэння беларускай Савецкай дзяржавы. VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б), якая адбылася 30—31 снежня ў Смаленску, абвясціла стварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і аб'явіла сябе I з'ездам КП(б)Б. 1 сту-

дзеня 1919 года быў сфарміраваны Часовы рабоча-сялянскі ўрад Беларусі на чале з З. Х. Жылуновічам (Цішкам Гартным), які абнародаваў устаноўчы маніфест. «З сёняшняга дня,— гаварылася ў маніфесце,— Беларусь — Савецкая рэспубліка — будзе рэспублікай працоўнага народа, рабочых, сялянскай беднаты і чырвонаармейцаў Беларусі».

2—3 лютага ў Мінску адбыўся I Усебеларускі з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў, на якім Я. М. Свярдлоў абвясціў пастанову Прэзідыума ВЦВК аб прызнанні незалежнасці БССР. З'езд прыняў Першую канстытуцыю БССР і дэкларацыю аб устанаўленні федэральнай сувязі з РСФСР. На з'ездзе быў выбраны ЦВК БССР на чале з А. Ф. Мясніковым.

У лютым 1919 года над Краінай Саветаў навісла новая пагроза з боку імперыялістаў. На гэты раз імперыялісты Антанты і ЗША выкарысталі буржуазна-памешчыцкую Польшчу, якая спрабавала расшырыць свае межы за кошт тэрыторыі Беларусі, Украіны і Літвы.

У мэтах аб'яднання рэвалюцыйных сіл для барацьбы з замежнай і ўнутранай контррэвалюцыяй з'езд Саветаў Беларусі і I з'езд Саветаў Літвы прынялі рашэнне стварыць Літоўска-Беларускую Рэспубліку (Літ-Бел ССР). 27 лютага на сумесным пасяджэнні ЦВК рэспублік створаны ЦВК Літ-Бел ССР (старшыня К. Г. Ціхоўскі) і СНК Літ-Бел ССР (старшыня В. С. Міцкявічус-Капсукас). Мера гэта была неабходная і своечасовая. У лютым 1919 года на маладую Савецкую дзяржаву пачалі наступленне падтрыманыя Антантай і ЗША войскі буржуазнай Польшчы. Значная частка Беларусі апынулася ў акупацыі.

Пасля вызвалення Беларусі ад белапольскай акупацыі 31 ліпеня 1920 года на сумесным пасяджэнні Мінскага ВРК і ЦК КП(б)Л і Б з прадстаўнікамі іншых арганізацый была прынята «Дэкларацыя аб абвяшчэнні Беларускай ССР», якая аднаўлялася на асновах і прынцыпах, вызначаных маніфестам 1 студзеня 1919 года. З 13 па 17 снежня 1920 года ў Мінску праходзіў II Усебеларускі з'езд Саветаў, які ўзаконіў незалежнасць Беларускай рэспублікі.

30 снежня 1922 года БССР увайшла ў састаў Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Пасля заканчэння грамадзянскай вайны працоўныя Савецкай Беларусі пачалі аднаўленне разбуранай войнамі народнай гаспадаркі і пабудову сацыялістычнага грамадства.

Надзвычай цяжкім было ў гэты перыяд становішча беларускага народа. Гаспадарчае разбурэнне прывяло да рэзкага скарачэння колькасці рабочага класа, масавага беспрацоўя. У 1920 годзе агульны аб'ём валавой прадукцыі прамысловасці Беларусі склаў толькі крыху больш чым 20 % ад узроўню 1913 года, а валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі — каля палавіны даваеннай.

Як у ваенны час, так і ў гады мірнага будаўніцтва, савецкія рэспублікі пераадольвалі цяжкасці сумеснымі намаганнямі. У снежні 1920 года РСФСР прадаставіла Беларусі крэдыт у 1 млн. рублёў. З Масквы, Петраграда і іншых прамысловых цэнтраў у Беларусь ішлі станкі, электраматоры і іншае тэхнічнае абсталяванне, з Украіны — метал і вугаль. Пасільную дапамогу аказвала іншым рэспублікам і Беларусь. Калі летам 1921 года насельніцтва Паволжжа, Паўднёвага Урала, Украіны галадала з-за моцнай засухі, рабочыя і служачыя рэспублікі праводзілі штомесячныя адлічэнні ад пайка і зарплаты на карысць галадаючых, сяляне датэрмінова здавалі дзяржаве харчпадатак, хлеб, прымалі ў свае сем'і дзяцей, вывезеных з губерняў, ахопленых голадам. Пра бескарыслівую дапамогу беларускага народа галадаючаму насельніцтву Паволжжа М. І. Калінін сказаў: «З незалежных савецкіх рэспублік я хацеў тут адзначыць адну, самую маленькую — гэта Беларускую рэспубліку... там развілі шырокую работу сярод насельніцтва і не толькі дапамагалі, але на аснове голаду звязалі найцяснейшымі вузамі беларускае насельніцтва з рускім галадаючым насельніцтвам і тым самым на жывой практыцы заклалі фундамент сапраўднага брацтва»[1].

Беларуская ССР разам з РСФСР, УССР і ЗСФСР з'явілася заснавальніцай федэратыўнай дзяржавы новага тыпу. 30 снежня 1922 года I Усесаюзны з'езд Саветаў, прыняўшы Дэкларацыю і Дагавор аб стварэнні СССР, які ўвасабляў дружбу і супрацоўніцтва народаў, замацаваў непарушны саюз і раўнапраўе савецкіх рэспублік. У братняй сям'і савецкіх народаў СССР з кожным годам умацоўвалася становішча Беларусі як суверэннай Савецкай рэспублікі.

У сям'і савецкіх рэспублік Беларусь ужо ў 1926 годзе завяршыла аднаўленне разбуранай гаспадаркі і ўзмоцнена развівала сваю эканоміку і культуру. У гады перадваенных пяцігодак у рэспубліцы была створана магутная сацыялістычная прамысловасць. У 1940 годзе валавы аб'ём яе павялічыўся ў параўнанні з 1913 годам больш чым у восем разоў. Як і ва ўсёй краіне, на шлях новага, сацыялістычнага жыцця стала сялянства Беларусі. Культурная рэвалюцыя вывела працоўныя масы рэспублікі з цемры і невуцтва да вяршынь ведаў, навукі і культуры.

У верасні 1939 года, калі над Заходняй Беларуссю і Украінай, якія пакутавалі пад прыгнётам буржуазна-памешчыцкай Польшчы, навісла пагроза захопу іх нямецка-фашысцкімі акупантамі, Савецкі ўрад узяў насельніцтва гэтых зямель пад сваю абарону. 17 верасня пачаўся вызваленчы паход савецкіх войск, у выніку якога збылася мара працоўных заходніх абласцей Беларусі аб уз'яднанні ў адзінай савецкай сацыялістычнай дзяржаве. Гэта адкрыла перад працоўнымі заходніх абласцей БССР шырокія магчымасці сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця.

Мірная стваральная праца савецкіх людзей была перапынена вераломным нападам фашысцкай Германіі. На барацьбу з гітлераўцамі ў варожым тыле, на акупіраванай савецкай тэрыторыі ўзнялося каля двух мільёнаў чалавек. Толькі ў Беларускай ССР у штабе партызанскага руху было зарэгістравана 375 тыс. партызан. Сфарміраваныя па рашэнню ЦК ВКПБ(б) і ЦК КП(б)Б партызанскія рэзервы налічвалі каля 400 тыс. чалавек. Больш як 70 тыс. патрыётаў дзейнічалі ў падпольных арганізацыях і групах. У 1943 годзе партызаны кантралявалі каля 100 тыс. $км^2$ або больш як 60 % тэрыторыі рэспублікі. У многіх раёнах была аднаўлена Савецкая ўлада.

Трохгадовая акупацыя нанесла рэспубліцы вялізную страту. Народная гаспадарка БССР была адкінута амаль да ўзроўню 1913 года. Уцалела толькі чацвёртая частка жылога фонду. Без жылля засталіся каля трох мільёнаў чалавек. За гады акупацыі фашысты забілі і закатавалі кожнага чацвёртага жыхара рэспублікі, а ў Віцебскай вобласці — кожнага трэцяга, сярод мужчынскага насельніцтва — кожнага другога. На катаржныя работы ў Германію было выгнана каля 380 тыс. чалавек.

Уся краіна дапамагала Беларусі як мага хутчэй залячыць нанесеныя вайной раны. Толькі за 2,5 года пасля вызвалення рэспубліка атрымала 50 тыс. адзінак прамысловага абсталявання, 10 тыс. аўтамашын, 15 тыс. розных сельскагаспадарчых машын, шмат будаўнічых матэрыялаў, жывёлы, насення, прадуктаў харчавання. Каля 500 вагонаў з рознымі грузамі прыйшло ў Беларусь з Сібіры, Урала, Грузіі. Горкі і Яраслаўль пастаўлялі высакаякасную сталь, Удмурцкая АССР — каляровыя металы, пермскія чыгуначнікі аказалі вялікую дапамогу ў аднаўленні чыгуначнай сеткі. На прадпрыемствах Масквы, Ленінграда, Урала, Сталінграда і іншых гарадоў была арганізавана падрыхтоўка кваліфікаваных кадраў для прамысловасці Беларусі. У сваю чаргу БССР нават у гэты цяжкі для яе час дапамагала іншым рэспублікам. Яна накіроўвала лесаматэрыялы для вугальных шахт Данбаса, прадпрыемстваў чорнай металургіі, чыгунак. Шматтысячны атрад беларускай моладзі працаваў на аднаўленні Данбаса і Сталінграда. Узаемадапамога савецкіх рэспублік у аднаўленні народнай гаспадаркі з'явілася новым сведчаннем вялікай жыццёвай сілы савецкага сацыялістычнага ладу.

У пасляваенны перыяд у рэспубліцы створаны новыя, прагрэсіўныя галіны прамысловасці, выпускаюцца сотні новых відаў прадукцыі, абнаўляецца яе асартымент. Такія галіны, як машынабудаванне і металаапрацоўка, электратэхніка, хімічная і нафтахімічная пачалі задаваць тон развіццю ўсёй эканомікі і цяпер вызначаюць яе аблічча, паскараюць працэс індустрыяльнага развіцця народнай гаспадаркі. Рэспубліка набыла зусім новае індустрыяльнае аблічча, стварыла эфектыўную галіновую структуру. Узрос яе эканамічны патэнцыял, магчымасці і роля ў адзіным народнагаспадарчым комплексе краіны.

Агульны аб'ём прамысловай прадукцыі цяпер амаль у 300 разоў перавышае дарэвалюцыйны ўзровень і ў 35 разоў — узровень 1940 года. За 10 дзён прамысловасць рэспублікі выпускае амаль столькі прадукцыі, колькі яе было выпушчана за ўвесь 1940 год.

Перабудова аказвае дабратворнае ўздзеянне на сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР. Нягледзячы на пэўныя аб'ектыўныя і суб'ектыўныя цяжкасці гаспадарчы 1987 год завяршыўся з нядрэннымі вынікамі ў

прамысловасці, капітальным будаўніцтве, сельскай гаспадарцы, на транспарце. Прырост нацыянальнага даходу за два гады бягучай пяцігодкі складаў 11,5 %, тэмпы росту прамысловай вытворчасці — 14 %. Прадукцыйнасць працы ў прамысловасці ўзрасла на 12,9 %. Па тэмпах прыросту аб'ёму прадукцыі (6,5 %) Беларусь займае першае месца сярод іншых рэспублік. Многія працоўныя калектывы ўжо ў 1987 годзе працавалі ва ўмовах поўнага гаспадарчага разліку і самафінансавання. У 1988 годзе на гэтыя ўмовы пераведзены прадпрыемствы і арганізацыі, якія выпускаюць 90 % прамысловай прадукцыі і выконваюць 70 % будаўніча-мантажных работ, а таксама ўсе калгасы і саўгасы, транспарт, сфера абслугоўвання. За два гады здадзена ў эксплуатацыю 11,4 млн. м² жылля, што на 27 % больш, чым за той жа перыяд мінулай пяцігодкі, 20 тыс. сем'яў справілі наваселле.

Поўная ліквідацыя безгаспадарчасці, умацаванне выканаўчай дысцыпліны, абуджэнне дзелавой ініцыятывы — вось далёка не поўны пералік яшчэ нявыкарыстаных рэзерваў для павышэння рытмічнасці вытворчасці, захавання дагаворных абавязацельстваў, павышэння тэхнічнага ўзроўню вырабаў.

Нарошчваецца аб'ём вытворчасці жывёлагадоўлі ў аграпрамысловым комплексе. У капітальным будаўніцтве ўзрасла доля сродкаў, накіроўваемых на тэхнічнае пераўзбраенне і рэканструкцыю вытворчасці. У 1987 годзе ўвесь прырост вытворчасці ўпершыню быў забяспечаны за кошт росту прадукцыйнасці працы, без павелічэння колькасці работнікаў, занятых у галіне матэрыяльнай вытворчасці.

Паслядоўна рэалізуецца актыўная сацыяльная палітыка партыі і дзяржавы. У рэспубліцы дасягнуты або перавышаны заданні на 1987 год па росту заработнай платы рабочых і служачых, аплаты працы калгаснікаў, грамадскіх фондаў спажывання, будаўніцтву жылля. «Прыемна, — заявіў А. А. Грамыка на сесіі Вярхоўнага Савета Беларусі 2 лютага 1988 года, — што інтэнсіфікацыя вытворчасці апіраецца на навукова-тэхнічны прагрэс. Гэта добрая візітная картка рэспублікі ў братняй сацыялістычнай сям'і народаў нашай краіны»[2].

Беларусь сёння самастойна рыхтуе неабходныя ёй кадры амаль па ўсіх асноўных спецыяльнасцях, якія патрабуюць прафесіянальна-тэхнічнай, спецыяльнай сярэдняй і вышэйшай адукацыі. Рознымі відамі навучання ахоплена 3,8 млн. чалавек, з іх у агульнаадукацыйных школах — 1,5 млн., у прафесіянальна-тэхнічных навучальных установах — 161 тыс., у сярэдніх спецыяльных навучальных установах — звыш 160 тыс., у вышэйшых навучальных установах — 182 тыс. чалавек.

Зараз 5,5 млн. чалавек маюць вышэйшую і сярэднюю адукацыю, што складае 85 % занятага насельніцтва рэспублікі. У народнай гаспадарцы Беларусі працуе звыш 1,2 млн. спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй — амаль у сем разоў больш, чым іх было ва ўсёй царскай Расіі. Да рэвалюцыі ў Беларусі не было ніводнай вышэйшай навучальнай установы, цяпер іх 33, у тым ліку тры універсітэты. У сістэме навукі і навуковага абслугоўвання занята 39 тыс. дактароў і кандыдатаў навук.

Паспяховае ажыццяўленне ленінскай нацыянальнай палітыкі, бяспрыкладны ўклад партызанскай рэспублікі ў разгром нямецкага фашызму забяспечылі БССР міжнародны аўтарытэт і прызнанне. З'яўляючыся членам ААН, Беларуская ССР паслядоўна праводзіць знешнюю палітыку Савецкай дзяржавы, накіраваную на забеспячэнне міру, разрадкі, умацаванне дружбы і супрацоўніцтва паміж народамі.

Горача адабраючы і аднадушна падтрымліваючы ўнутраную і знешнюю палітыку КПСС, беларускі народ бачыць свой першы абавязак у тым, каб з поўнай аддачай сіл, ведаў, вопыту працаваць над ажыццяўленнем грандыёзных задач камуністычнага будаўніцтва.

[1] Калинин М. И. Избранные произведения. М., 1960. Т. 1. С. 318.
[2] Советская Белоруссия. 1988. 3 февраля.